Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

24 КРАСАВІКА 2018 г. АЎТОРАК № 77 (28693)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## Сёння Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка звернецца са штогадовым Пасланнем да беларускага народа і Нацыянальнага сходу



**Традыцыйна на мерапрыемства ў Авальную залу Дома ўрада запрошаны найвышэйшыя службовыя асобы краіны, члены ўрада, кіраўнікі органаў дзяржкіравання, найбуйнейшых прадпрыемстваў, вядучых ВНУ, банкаў, прадстаўнікі дыпламатычнага корпуса, сродкаў масавай інфармацыі.**

**Выступленне кіраўніка дзяржавы будзе транслявацца ў прамым эфіры па тэлеканалах «Беларусь 1», «Беларусь 24» і Першым нацыянальным канале Беларускага радыё. Трансляцыя пачнецца ў 10.30. Тэлеверсія Паслання будзе паказана ў вячэрнім эфіры беларускіх тэлеканалаў.**

# ДА СВАІХ КАРАНЁЎ — З ЛЮБОЎЮ І ПАВАГАЙ

### На рэспубліканскім суботніку Аляксандр Лукашэнка з трыма сынамі добраўпарадкаваў Трафімаву крыніцу на сваёй малой радзіме

**Прэзідэнт працаваў каля аграгарадка Александрыя ў Магілёўскай вобласці. Трафімава крыніца была адноўлена некалькі гадоў таму, вада ў ёй чыстая і асвечаная, па яе прыязджаюць не толькі з навакольных гарадоў і раёнаў, але і з Расіі. Месца сталі называць так па імені дзеда Прэзідэнта, цесляра Трафіма, які ўладкаваў крыніцу. У дзяцінстве тут вельмі любіў адпачываць Аляксандр Лукашэнка.**



Фота БелТА.

«Для мяне незвычайна тут усё. Гэта мая радзіма. Тут няма квадратнага метра, дзе я ў свой час не хадзіў басанож. Або кароў пасвілі — тут быў свабодны луг, ён зарос у нашы часы, тут мы нарыхтоўвалі дровы. Таму кожны метр падмяты маімі дзіцячымі нагамі, — падзяліўся ўспамінамі кіраўнік дзяржавы. — Таму для мяне тут усё да гэтага часу незвычайна і ў той жа час звыкла».

Падчас суботніка тры брыгады саджалі дрэвы і кусты, уладкоўвалі клумбы і дарожкі, збіралі і вешалі шпакоўні. Акрамя таго, быў усталяваны памятны знак з кароткай гісторыяй гэтага месца.

У гутарцы з журналістамі Прэзідэнт адзначыў, што Год малой радзімы, якім у нашай краіне аб'яўлены 2018-ы, — гэта толькі пачатак адпаведнай працы. «Гэта нават не Год малой радзімы, а трохгодка, таму што за год мы наўрад ці нешта там пабудуем, створым. Адразу людзей не павернеш [...], — сказаў кіраўнік дзяржавы. — І тады я прапанаваў, давайце мы аб'явім гэты Годам малой радзімы і падумаем пра падаўжэнне. Таму гэта толькі старт».

На думку беларускага лідара, прыводзячы ў парадак аграгарадкі, не варта забываць таксама пра буйныя і звычайныя вёскі, пасёлкі гарадскога тыпу, былыя цэнтры гаспадарак.

Акрамя гэтага, Аляксандр Лукашэнка адзначыў стабільную сітуацыю ў валютнай сферы і пытанні інфляцыі. «Рубель у нас пакуль стабільны. А чаканні... Я праводжу паралель. Памятаеце, калі мы вымушаныя былі перайсці да больш жорсткай грашова-крэдытнай палітыкі. Усё роўна адтуль гэтыя чаканні па дэвальвацыі рубля ішлі. Людзі думалі, што будзе з рублём. Але сёння вы ўжо пра гэта практычна забыліся, — нагадаў Прэзідэнт. — Так, у Расіі часта крычаць з гэтай нагоды, ну і мы чуем гэта. Але ўжо няма гэтых ваганняў, няма валацільнасці на валютным рынку, на фондавых рынках і гэтак далей. Таму больш стабільна стала».

Ён таксама дадаў, што ў мінулым годзе ў нас атрымалася захаваць інфляцыю на прымальным спрагназаваным узроўні, і прызнаў, што інфляцыя яшчэ ёсць, аднак адпаведная работа вядзецца.

Яшчэ кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ў Беларусі няма ніякіх падстаў для росту цэн. Ён прывёў у прыклад ЖКГ, дзе было прынята рашэнне не павышаць іх больш чым на пяць долараў у год. Няма прычын павышаць цэны і на прадукты, паколькі абсалютная большасць харчавання — беларускай вытворчасці, а імпартны складнік невялікі. Такое магчыма толькі ў выпадку форс-мажору звонку, аднак беларускі лідар выказаў упэўненасць, што гэтага не адбудзецца.

### Маленькі ўклад у велізарную справу

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Наталля Качанава падчас рэспубліканскага суботніка займалася добраўпарадкаваннем тэрыторыі вакол Сафійскага сабора ў Полацку, садзіла туі. На яе думку, паўдзельнічаць у такім мерапрыемстве ў тых месцах, дзе прайшло дзяцінства, — вялікае задавальненне, бо кожнага цягне на радзіму. «Кожны можа адчуць сваё дачыненне да агульнай вялікай справы. Пакінуць добры след на сваёй малой радзіме — гэта выдатна», — сказала Наталля Качанава.

СТАР. 2

# Золата найвышэйшай пробы



Абрад «Залатое вяселле» адзначыла ў палескім аграгарадку Тонеж Лельчыцкага раёна сям'я Івана і Надзеі ДРЫНЕЎСКІХ. За паўвекавы тэрмін сумеснага жыцця яны выгадавалі чацвярых дзяцей, і 21 красавіка залатое вяселле разам з Іванам і Надзеяй адзначалі таксама восем унукаў і сем праўнукаў.



Фота БелТА.

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Андрэй ШОРАЦ, старшыня Мінгарвыканкама:**

*«У сталіцы праводзіцца паслядоўная работа па ўпарадкаванні функцыянавання аб'ектаў сезоннага нестацыянарнага гандлю, удасканаленні іх знешняга выгляду, умоў арганізацыі гандлю. У Мінску неабходна больш шырока ўкараняць сучасныя фарматы сезоннага гандлю. Прадстаўленыя ў горадзе палаткі па продажы прахаладжальных напояў, марожанага, гародніны і садавіны не адпавядаюць сталічнаму статусу. Гарадскім службам неабходна вывучыць вопыт іншых гарадоў у гэтай сферы і ўнесці прапановы па развіцці сеткі нестацыянарных гандлёвых аб'ектаў, наладзіць узаемадзеянне з прадстаўнікамі прыватнага бізнесу ў гэтым пытанні».*

■ Экспертыза

# ЯКІЯ ЗМЕНЫ НА ДРУГАСНЫМ РЫНКУ ЖЫЛЛЯ

**Пачатак года на рынку жылля выступае перыядам «разварушвання» для пакупнікоў. Інтэнсіўны рост пакупніцкай актыўнасці звычайна пачынаецца толькі вясной. Але не сёлета — першы квартал быў не менш актыўны, чым вясна мінулага года. Па звестках аддзела кансалтынгу і аналітыкі групы кампаній «Твая сталіца», колькасць прададзеных па Мінску кватэр за студзень—сакавік гэтага года на 24 % большая, чым за аналагічны перыяд летась.**

### Прадаўцы заварушыліся

На думку аналітыкаў жыллёвай сферы, пачатак года адзначыўся рэкордна нізкай колькасцю прапанаваных на продаж кватэр — крыху больш за пяць тысяч, у той час як сярэдні ўзровень складае ад 7 да 7,5 тысячы кватэр.

Інтэнсіўнае скарачэнне аб'ёму прапановы пачалося яшчэ ў другой палове мінулага года і прыкметна паскорылася ў апошнія яго месяцы. Збольшага гэта адбывалася з-за высокай пакупніцкай актыўнасці, якая грунтавалася на патаннелых крэдытах і пазітыўных чаканнях у дачыненні да росту даходаў. Але таксама адзначаліся і выпадкі зняцця некаторымі прадаўцамі кватэр з продажу ў чаканні яшчэ большага росту цэн.

Увесь студзень і люты асаблівых змен у колькасці прапанаваных на продаж кватэр не было — пакупнікі адчувалі відавочную абмежаванасць выбару. Але ўжо з сакавіка рынак пачаў напаўняцца свежымі прапановамі і за месяц колькасць кватэр вырасла на 6 %. У прыватнасці, на рынак сталі выходзіць прадаўцы, якія адкладвалі продаж нерухомасці да яшчэ большага павелічэння цэн.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

— Паколькі большасць здзелак здзяйсняюцца ў фармаце «ланцужкоў», калі адна кватэра прадаецца з мэтай набыцця іншай з даплатай, то сэнсу ў адкладванні продажу няма, паколькі купляць іншую кватэру трэба будзе таксама па больш высокіх цэнах, — каментуе сітуацыю **намеснік дырэктара па продажах на другасным рынку жылля агенцтва нерухомасці «Твая сталіца» Святлана КУДЗЕЛКА.** — У перыяд нестабільнасці на рынку, няхай гэта будзе рост або зніжэнне цэн, ці варта купляць кватэру менавіта зараз альбо трэба пачакаць? Калі казаць пра «сёння», то бягучы момант адназначна спрыяльны для куплі жылля, паколькі цэны яшчэ не моцна выраслі ў параўнанні з тым дном, да якога яны апусціліся ў 2016 годзе, ды і крэдыты выступаюць дзейснымі памочнікамі.

Варта адзначыць, што дастаткова высокая актыўнасць пакупнікоў дазваляе прадаўцам выбраць найлепшую па цане прапанову ад патэнцыйнага пакупніка. Аднак, даходы такіх пакупнікоў не настолькі высокія, каб прадавец мог залішне «задзіраць» кошт.

### «Квадрат» падрос адразу на 200 рублёў

На працягу першага квартала цэны працягвалі штомесяц павялічвацца. Прадаўцы, улавіўшы тэндэнцыю росту цэн, сталі актыўна выстаўляць кватэры на продаж зусім не па дэмакратычных цэнах мінулага года. У выніку толькі за сакавік цэны прапановы выраслі на 2 %, а ў параўнанні са снежнем мінулага года — на 5 %.

СТАР. 2

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### ГЕНЕРАЛЬНЫ САКРАТАР ААН АБВЯСЦІЎ АБ ПАЧАТКУ НОВАЙ ХАЛОДНАЙ ВАЙНЫ

Генеральны сакратар ААН Антоніу Гутэрыш прызнаў неэфектыўнасць Савета Бяспекі і расказаў пра пачатак новай халоднай вайны. Пра гэта ён заявіў у інтэрв'ю шведскаму тэлеканалу SVT. «Халодная вайна вярнулася», — заявіў ён, адзначыўшы, што ў параўнанні з аналагічным перыядам XX стагоддзя ёсць істотныя адрозненні. «Тады быў сур'ёзны канфлікт паміж ЗША і Савецкім Саюзам. Цяпер Вашынгтон і Масква не кантралююць усіх, як гэта было раней. Многія краіны вельмі актыўныя ў рэгіёне: Турцыя, Іран, Саудаўская Аравія і іншыя, няма двух аднародных кантраляваных блокаў», — растлумачыў Антоніу Гутэрыш. «Падчас халоднай вайны існавалі функцыі для дыялогу, кантролю і камунікацыі, каб гарантаваць, што, калі ўзнікне рызыка канфрантацыі, падзеі не будуць выходзіць за межы кантролю. Зараз у іх больш няма механізмаў. Вось чаму сітуацыя настолькі небяспечная», — заўважыў генеральны сакратар.

### НА ПРЭЗІДЭНЦКІХ ВЫБАРАХ У ПАРАГВАІ ПЕРАМОГ КАНСЕРВАТАР БЕНІТЭС

Кандыдат ад кіруючай у Парагваі кансерватыўнай партыі Colorado Марыа Абдо Бенітэс перамог на выбарах прэзідэнта. Пра гэта паведаміў старшыня выбарчай палаты рэспублікі Хаіме Бестар. У сваёй праграме 46-гадовы Бенітэс, які склаў з сябе парламенцкія паўнамоцтвы дзеля ўдзелу ў прэзідэнцкай гонцы, прапануе падтрымліваць нізкі ўзровень падаткаў як для мясцовых, так і замежных кампаній, узмацніць кантроль дзяржаўных межаў і барацьбу з наркатрафікам, павялічыць колькасць працоўных месцаў за кошт рэалізацыі інфраструктурных праектаў. Ён таксама абяцае павысіць тэмпы росту эканомікі да 6 % у год і выказваецца супраць легалізацыі аднаполых шлюбаў. Інаўгурацыя новага прэзідэнта, абранага на пяцігадовы тэрмін, павінна прайсці 15 жніўня. Брытанская The Financial Times адзначае, што Парагвай стаў чацвёртай краінай Лацінскай Амерыкі пасля Чылі, Перу і Аргенціны, насельніцтва якой на апошніх выбарах падтрымала кандыдата ад правага крыла.



ISSN 1990 - 763X

### ВЫБУХ СМЯРОТНІКА Ў КАБУЛЕ ЗАБРАЎ ЖЫЦЦІ БОЛЬШ ЗА ПАЎСОТНІ ЧАЛАВЕК

Пасля выбуху ў цэнтры рэгістрацыі выбаршчыкаў у Кабуле загінулі па меншай меры 57 чалавек, паведамляюць улады Афганістана. Па апошніх звестках, 119 чалавек былі параненыя ў выніку выбуху ў натоўпе людзей, якія чакалі каля ўвахода ў цэнтр. Па інфармацыі мясцовых СМІ, сярод загінулых — 21 жанчына і пяць дзяцей. Адказнасць за напад узяла на сябе экстрэмісцкая групоўка «Ісламская дзяржава» (ІД). Рэгістрацыя выбаршчыкаў на выбары, якія павінны прайсці ў кастрычніку, пачалася раней у гэтым месяцы. За гэты час адбыўся шэраг нападаў на цэнтры рэгістрацыі. Міністр унутраных спраў Афганістана расказаў Бі-бі-сі, што «Талібан» і ІД забіваюць грамадзянскіх асоб, каб настроіць людзей супраць урада і справакаваць хаос. За выбарамі ў заканадаўчыя органы ўлады сёлета рушаць услед прэзідэнцкія выбары ў 2019 годзе. Паводле ацэнак Бі-бі-сі, урад Афганістана цалкам кантралюе толькі 30 працэнтаў тэрыторыі краіны, у той час як астатнія раёны знаходзяцца пад пагрозай нападаў «Талібана» і, у меншай ступені, ІД.

## КОРАТКА

Кейт Мідлтан нарадзіла ўчора хлопчыка ў шпіталі святой Марыі ў Лондане, паведамілі ў Кенсінгтонскім палацы, прынц Уільям прысутнічаў пры родах. Пол трэцяга дзіцяці герцагіні і яе мужа трымалі ў таямніцы да апошняга моманту.

**У Гродзенскай вобласці за становішчам у лясах будуць сачыць квадракоптары. Таксама на 2018 год запланавана развіццё сістэмы відэаназірання за ляснымі масівамі.**

Раннія яравыя ў Беларусі па стане на 23 красавіка пасеяны на плошчы 616,4 тыс. га, або 60,5 % плана.

**На чэмпіянаце свету ў Расіі юніёрская зборная Беларусі па хакеі (U-18) перамагла каманду Швейцарыі з лікам 5:4 (0:2, 2:0, 3:2). Перамога падапечных Паўла Перапехіна стала першай пасля двух паражэнняў і дазволіць зборнай выступіць у плэй-оф.**

■ Стыхія

# МОЦНЫ ВЕЦЕР: ПАВАЛЕНЫЯ ДРЭВЫ І ПЯСЧАНАЯ БУРА

**Згодна з інфармацыяй Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, з-за парываў ветру (да 27 м/с) пацярпелі 15 населеных пунктаў у трох раёнах Магілёўскай вобласці, у трох раёнах Мінскай вобласці і ў адным раёне Віцебскай вобласці.**

Былі пашкоджаны дахі трох жылых дамоў, двух аб'ектаў сацкультбыту і 24 сельскагаспадарчых будынкаў. Зафіксаваны 34 выпадкі небяспечных падзенняў дрэў у Магілёўскай (20 выпадкаў), Мінскай (восем выпадкаў) абласцях і ў сталіцы (шэсць выпадкаў), у выніку якіх пашкоджаны тры легкавыя аўтамабілі. Пацярпелых няма. Работнікамі МНС і іншых арганізацый праводзіліся работы па распілоўцы і ўборцы дрэў.

Па інфармацыі «Белэнерга», на працягу сутак на тэрыторыі краіны перыядычна парушалася электразабеспячэнне 996 населеных пунктаў. Акрамя гэтага, моцны вецер спрыяў распаўсюджванню агню ў час пажараў у экасістэмах.

З-за адсутнасці электраэнергіі было парушана водазабеспячэнне ў аграгарадку Сеніца Мінскага раёна.

На трасе М1 (Брэст — Мінск — граніца Расіі), на ўчастку дарогі паміж Дзяржынскам і Баранавічамі, адбылася нязвыклая для Беларусі з'ява — пясчаная бура. Верагодна, з палёў падняўся сухі пясок. Бура стала прычынай гібелі чалавека.



abw.by

Па інфармацыі УДАІ УУС Мінаблвыканкама, памёр пасажыр легкавушкі, якая ўляцела ў фуру на дарозе М1. Моцны вецер мог стаць прычынай аварыі, якая адбылася паблізу вёскі Малінаўка ў Нясвіжскім раёне. Раптам падняўся слуп пылу, і кіроўца велікагруза пачаў зніжаць хуткасць з-за дрэннай бачнасці. Кіроўца легкавога аўтамабіля, які рухаўся за аўтапоездам, не паспеў своечасова прытармазіць, адбылося ДТЗ. У выніку спадарожнага сутыкнення 26-гадовы пасажыр аўтамабіля «Вольва» з цяжкімі траўмамі быў шпіталізаваны ў рэанімацыйнае аддзяленне бальніцы, дзе праз некаторы час памёр.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ДА СВАІХ КАРАНЁЎ — З ЛЮБОЎЮ І ПАВАГАЙ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Прэм'ер-міністр Беларусі Андрэй Кабякоў удзельнічаў у пасадцы лесу ў Акінчыцкім лясніцтве Стаўбцоўскага лясгаса. Ён расказаў журналістам, што палова заробленых на суботніку грошай (з выніковых амаль 7,5 млн беларускіх рублёў) дапаможа абнавіць медыцынскую інфраструктуру да II Еўрапейскіх гульняў, а астатнія сродкі накіруюць на добраўпарадкаванне і прывядзенне ў належны стан населеных пунктаў, пахаванняў часу Вялікай Айчыннай вайны, мемарыялаў, месцаў баявой і воінскай славы, а таксама на падрыхтоўку да лета дзіцячых лагераў. Дарэчы, намеснік прэм'ер-міністра, кіраўнік рабочай групы па падрыхтоўцы і правядзенні суботніка Міхаіл Русы паведаміў, што, па папярэдніх даных, у суботніку паўдзельнічалі каля трох млн чалавек.

Старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл Мясніковіч прыняў удзел у навядзенні парадку на тэрыторыі палацава-паркавага ансамбля Рдултоўскіх. Спікер заявіў, што палац можа быць адным з элементаў Нясвіжскага залатога турыстычнага кальца, а таксама расказаў, што сумесна з Мінкультуры і Мінбудархітэктуры дасягнута дамоўленасць аб занаванні тэрыторыі ансамбля дзеля таго, каб усе аб'екты комплексу былі задзейнічаны эфектыўна.

**Паводле БелТА.**

## ■ Парламенцкі дзённік

# ЗНАКАВАЕ МЕСЦА

### Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў на суботніку добраўпарадкавалі мемарыяльны комплекс «Трасцянец»

**Помнік пабудаваны на месцы аднайменнага, чацвёртага па колькасці знішчаных вязняў, канцэнтрацыйнага лагера часоў Другой сусветнай вайны. Ахвярамі злачынстваў у «Трасцянцы» сталі звыш 206 тысяч чалавек.**

— Гэта знакавае месца не толькі для Заводскага раёна, горада Мінска, краіны, але і для ўсёй міжнароднай грамадскасці. Гэта першая лінія гісторыка-культурных каштоўнасцяў мемарыяльнага комплексу «Трасцянец». Актыўна ідзе работа па ўзвядзенні другой лініі комплексу — урочышча «Благаўшчына», дзе адбываліся расстрэлы і знаходзіліся месцы пахавання вязняў канцэнтрацыйнага лагера, — расказала **Аксана НЯХАЙЧЫК, дэпутат Палаты прадстаўнікоў па Шабаноўскай выбарчай акрузе № 91.**

Па словах парламентарыя, адкрыццё другой чаргі комплексу запланавана ў ліпені 2018 года. Першая лінія мемарыяла поўнасцю была пабудавана на сродкі бюджэту, фондаў суботнікаў, уласныя ўзносы грамадзян, аб'яднанняў.

— Калі была першая чарга адкрыта, сюды прыязджалі прадстаўнікі Германіі, Англіі, Ізраіля і іншых краін. У гэтым месцы знішчалі не толькі савецкіх палонных. Міжнародныя фонды таксама вырашылі ахвяраваць грошы для далейшага будаўніцтва комплексу, — адзначыла Аксана Няхайчык.

На тэрыторыі комплексу працавала толькі частка дэпутатаў. Большасць парламентарыяў у Год малой радзімы вырашыла прыняць удзел у суботніках у сваіх рэгіёнах.

Па традыцыі частка сродкаў, заробленых на рэспубліканскай акцыі, пойдзе на падрыхтоўку дзіцячых аздараўленчых лагераў і на ўладкаванне гісторыка-культурных каштоўнасцяў.

**Марыя ДАДАЛКА**

■

## ■ Суседзі

# Адкрытае пытанне

### Захаванне членства Украіны ў СНД адпавядае інтарэсам яе народа

**Аб гэтым учора заявіў старшыня Выканаўчага камітэта — выканаўчы сакратар СНД Сяргей ЛЕБЕДЗЕЎ перад пачаткам пасяджэння Савета пастаянных паўнамоцных прадстаўнікоў дзяржаў — удзельніц Садружнасці пры статутных і іншых органах Садружнасці.**

«Натуральна, мы звярнулі ўвагу на заявы прэзідэнта Украіны Парашэнкі з даручэннем ураду разгледзець пытанне аб магчымасці выхаду з Садружнасці Незалежных Дзяржаў, але гэта пакуль толькі даручэнні, — адзначыў Сяргей Лебедзеў. — Якое прыме рашэнне ўрад, якія рэкамендацыі будуць дадзены, мы яшчэ пачакаем».

Ён таксама дадаў, што большасць экспертаў схіляецца да таго, што такі выхад не быў бы на карысць ні Украіне, ні іншым краінам Садружнасці. «Украіна ў сілу свайго геаграфічнага становішча, цесных даўніх сувязяў з краінамі Садружнасці, вядома ж, разглядаецца як наш сусед, партнёр. Большасць дзяржаў СНД былі б зацікаўлены ў тым, каб Украіна заставалася і далей нашым добрым суседам», — сказаў Лебедзеў.

Старшыня Выканаўчага камітэта — выканаўчы сакратар СНД дадаў, што зацікаўленасць у захаванні шырокага ўзаемадзеяння з Украінай ёсць. Дарэчы, ніякіх паведамленняў, афіцыйных апавяшчэнняў, зваротаў у органы СНД ад Украіны не паступала, а шматлікія лісты самога Лебедзева застаюцца без адказу.

Акрамя таго, у размове з журналістамі кіраўнік Антытэрарыстычнага цэнтра дзяржаў — удзельніц СНД генерал-палкоўнік паліцыі Андрэй НОВІКАЎ заявіў, што ў верасні ў Кыргызстане рыхтуюцца буйныя вучэнні. У іх прымуць удзел у тым ліку прадстаўнікі КДБ і Міністэрства абароны Беларусі. На пытанне аб тым, якая колькасць дзяржаў будзе задзейнічана, Новікаў нагадаў, што ў апошні час у актыўнай фазе вучэнняў прымаюць удзел 6—7 краін.

* * *

Прэм'ер-міністр Арменіі Серж Саргсян падаў у адстаўку. Сыход з пасады адбыўся на фоне масавых акцый пратэсту ў краіне.

«Нікол Пашынян (*прадстаўнік апазіцыі*. — **«Зв».**) меў рацыю. Я памыляўся. Сітуацыя, якая склалася, мае некалькі рашэнняў, але ні на адно з іх я не пайду. Гэта не маё. Я выконваю ваша патрабаванне і пакідаю пасаду прэм'ер-міністра краіны», — гаворыцца ў заяве Сержа Саргсяна, якое распаўсюдзіла яго прэс-служба.

Масавыя мітынгі пачаліся ў Ерэване і іншых гарадах Арменіі 16 красавіка ў сувязі з вылучэннем кандыдатуры экс-прэзідэнта краіны Сержа Саргсяна на пасаду прэм'ер-міністра, супраць чаго выступіла апазіцыя. На наступны дзень, 17 красавіка, парламент Арменіі выбраў Сержа Саргсяна прэм'ерам. Мітынгі працягнуліся. 22 красавіка паліцыя Арменіі заявіла пра рашэнне разагнаць акцыі апазіцыі ў Ерэване, калі яны не будуць спыненыя ва ўстаноўлены тэрмін.

Прэзідэнцкі тэрмін Сержа Саргсяна скончыўся 9 красавіка 2018 года. На гэты пост ён абіраўся двойчы — у 2008 і 2013 гадах. Саргсян ужо быў прэм'ер-міністрам Арменіі ў 2007—2008 гадах.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ, Вераніка ПУСТАВІТ**

■

## ■ Сувязь

# РАЗМОВЫ ПА МАБІЛЬНІКУ ПАДАРАЖЭЮЦЬ

Мабільны аператар МТС абвясціў аб павышэнні з 1 мая тарыфаў на паслугі сувязі. Як паведамляецца на сайце кампаніі, кошт асноўных паслуг сотавай сувязі вырасце на 3 % да ўзроўню дзеючых тарыфаў. Перагляд тарыфаў абумоўлены неабходнасцю развіцця інфраструктуры, укараненнем новых тэхналагічных рашэнняў і развіццём лічбавых прадуктаў. Памеры штомесячных плацяжоў па растэрміноўцы за абсталяванне ў рамках раней заключаных дагавораў застаюцца нязменныя.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

■

# АСАБІСТЫ ЎКЛАД У БУДОЎЛЮ ГОДА

## У краіне прайшоў маштабны суботнік



Работнікі Хойніцкай СШ № 43 падчас суботніка.

Фота БелТА.

**Старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай ШАРСНЁЎ, памочнік Прэзідэнта — інспектар па Віцебскай вобласці Аляксандр СУБОЦІН, старшыня аблсавета Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ падчас суботніка бралі ўдзел у добраўпарадкаванні мемарыяльнага комплексу ў Расонскім раёне.**

Гэта месца памяці занесена ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь.

Працавалі разам з імі кіраўнікі структур аблвыканкама, абласнога ўзроўню праваахоўных органаў, ведамстваў...

Удзельнікі суботніка выканалі работы па падсыпцы дарожак, займаліся добраўпарадкаваннем тэрыторыі.

Комплекс пабудаваны ў 1965 годзе на месцы пахавання больш за 2,5 тысячы савецкіх воінаў і партызан. Там пахаваныя і члены падпольнай групы, расстраляныя фашыстамі 16 верасня 1942 года. Сярод іх — маці П. М. Машэрава, Дар'я Пятроўна.

Удзельнікі суботніка ўсклалі кветкі ў знак даніны памяці ўсіх, хто ўвайшоў у летапіс Расоншчыны.

Мікалай Шарснёў нагадаў пра іншыя памятныя мясціны ў Віцебскай вобласці, дзе вяліся, ажыццяўляюцца і плануецца праводзіць работы па добраўпарадкаванні, мадэрнізацыі. У прыватнасці, пра мемарыяльныя комплексы: «Рыленкі» ў Дубровенскім раёне, «Прарыў» — ва Ушацкім.

Дарэчы, плануецца мемарыял на Расоншчыне поўнасцю прывесці ў парадак да 9 мая. На сёння гатоўнасць каля 80 %. Для завяршэння ўсіх работ на аб'екце неабходна яшчэ каля 150 тысяч рублёў.

* * *

**430 тысяч жыхароў Гомельскай вобласці прынялі ўдзел у рэспубліканскім суботніку.**

Намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Уладзімір Жаўняк прыехаў на сваю малую радзіму ў Хойніцкі раён, каб разам з дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў Святланай Чэкан і Людмілай Макарынай-Кібак пасадзіць лес у Хойніцкім лясгасе. Тут жа працаваў і памочнік Прэзідэнта Беларусі — інспектар па Гомельскай вобласці Юрый Шулейка. Сумеснымі намаганнямі было высаджана каля пяці тысяч хвой на дзялянцы, дзе летась насаджэнні пашкодзіў жук-караед.

У дзень суботніка прыведзены ў парадак населеныя пункты і зялёныя зоны, добраўпарадкавана больш за тысячу мемарыяльных комплексаў, мясцін баявой славы, пахаванняў воінаў і партызан Вялікай Айчыннай вайны. Дэпутаты Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў і Гомельскага гарадскога Савета дэпутатаў прынялі ўдзел у добраўпарадкаванні лясной тэрыторыі ў Навабеліцкім раёне.

У Гомелі на працягу некалькіх гадзін у станоўчы бок змянілася зона адпачынку на скрыжаванні вуліц Барадзіна і Каменшчыкава. Бераг невялікага вадаёма насупраць Валатаўскага пляжа ўпрыгожылі 60 жоўтых вербаў. У адным з двароў на Рэчыцкім праспекце ўстаноўлена новае абсталяванне для гульні дзяцей. Там жа пасаджана дэпутацкая алея. Міністр ЖКГ Беларусі Аляксандр Церахаў сумесна з работнікамі ЖКГ Гомеля пасадзіў дрэвы ўздоўж галоўнай дарогі новага мікрараёна Шведская горка.

Грашовыя сродкі, сабраныя падчас суботніка, пойдуць на падтрыманне інфраструктуры раёнаў Гомельшчыны: у сферу аховы здароўя, адукацыі, падрыхтоўку дзіцячых аздараўленчых устаноў да летняга сезона...

* * *

**У Гродзенскай вобласці падчас суботніка актыўныя работы вяліся на аб'ектах гістарычнай спадчыны.**

На адным з самых знакавых аб'ектаў — палацава-паркавым комплексе ў Свяцку — працавалі работнікі аблвыканкама на чале з губернатарам Уладзімірам Краўцовым, а таксама памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гродзенскай вобласці Сяргей Раўнейка, міністр юстыцыі Алег Сліжэўскі.

Асноўныя работы ў гэты дзень вяліся тут на адным з будынкаў, дзе ў будучым размесціцца адміністрацыйны комплекс. Чыноўнікі папрацавалі на заліўцы і сцяжцы бетону. Уладзімір Краўцоў працуе на суботніку ўжо другі год запар і можа ацаніць дынаміку работ. Па яго словах, да канца года першы пускавы комплекс аб'екта будзе здадзены.

Старшыня аблвыканкама адзначыў, што падчас суботніка актыўныя работы вяліся на шэрагу іншых гістарычных аб'ектаў вобласці. Гэта і музей-сядзіба Агінскіх у Смаргонскім раёне, і замкі ў Гродне, Лідзе, Навагрудку, Гальшанах, Крэве.

Падчас суботніка гродзенцы працавалі на добраўпарадкаванні памятных мясцін сваіх населеных пунктаў, расчышчалі тэрыторыю, рыхтавалі да сезона адпачынку дзіцячыя летнікі.

* * *

**У рэспубліканскім суботніку прыняло ўдзел больш за 320 тысяч жыхароў Магілёўскай вобласці.**

Адной з асноўных пляцовак рэспубліканскага суботніка ў Магілёве стаў парк Падміколле і месца будаўніцтва галоўнай лесвіцы. Існуе даручэнне кіраўніка дзяржавы менавіта гэтую мясцовасць давесці да ўзорнага ўзроўню, каб яна стала адной з візітовак горада і зручным месцам для адпачынку магіляўчан. Тут працавалі губернатар вобласці Уладзімір Даманеўскі, намеснік главы Адміністрацыі Прэзідэнта Мікалай Снапкоў, міністр па архітэктуры і будаўніцтве Анатоль Чорны, старшыня камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Ігар Марзалюк.

Удзел у добраўпарадкаванні Падмікольскага парку прыняў і мэр горада Уладзімір Цумараў.

— Парк будзе цалкам падрыхтаваны да V Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі. На завяршэнне работ па яго добраўпарадкаванні сёлета запланавана каля двух мільёнаў рублёў, — адзначыў ён.

Дарэчы, у Падмікольскім парку высадзілі ў гэты дзень 700 дрэў.

Міністр па падатках і зборах Сяргей Налівайка працаваў у Бабруйску разам з кіраўніцтвам горада на будаўніцтве сярэдняй школы ў мікрараёне Заходні. А міністр сувязі і інфарматызацыі Сяргей Папкоў разам з работнікамі Дрыбінскага райвыканкама саджаў дрэвы ў Раснянскім лясніцтве. У Слаўгарадскім і Асіповіцкім раёнах саджалі дрэвы і прыводзілі ў парадак тэрыторыі дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Таццяна Кананчук і Аляксандр Багдановіч. А старшыня праўлення Беларускага рэспубліканскага саюза спажывецкіх таварыстваў Валерый Іваноў разам з адміністрацыяй Клімавіцкага раёна ўдзельнічаў у закладцы сквера на тэрыторыі тутэйшага аграрнага каледжа.

* * *

**Значна пахарашэла Мінскшчына пасля рэспубліканскага суботніка.**

У мерапрыемстве дзяржаўнай важнасці прынялі ўдзел прадстаўнікі мясцовай улады, грамадскіх арганізацый, прадпрыемстваў , моладзь і ветэраны. Хтосьці працаваў на сваім рабочым месцы, а нехта добраўпарадкаваў тэрыторыі населеных пунктаў, прыводзіў у належны стан помнікі культуры, гісторыі, архітэктуры, месцы пахавання воінаў і мірных жыхароў у гады Вялікай Айчыннай вайны. У прыватнасці, старшыня Мінаблвыканкама Анатоль Ісачанка разам з памочнікам Прэзідэнта — інспектарам па Мінскай вобласці Ігарам Яўсеевым і прадстаўнікамі Мінаблвыканкама пасадзілі ліпавую алею на малой радзіме беларускага песняра Якуба Коласа ў вёсцы Акінчыцы Стаўбцоўскага раёна.

Падчас суботніка ў парадак прывялі таксама ўрочышча Курапаты, Курган Славы. Міністр інфармацыі Аляксандр Карлюкевіч добраўпарадкаваў месца пахавання і саджаў дрэвы на сваёй малой радзіме ў аграгарадку Пухавічы. А галоўны рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура» Віктар Шніп працаваў на добраўпарадкаванні сядзібы Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча ў Валожынскім раёне.

* * *

**Прадстаўнікі Адміністрацыі Прэзідэнта і Мінгарвыканкама падчас рэспубліканскага суботніка заняліся добраўпарадкаваннем стадыёна «Дынама». Адкрыццё гэтага спартыўнага аб'екта запланавана на 21 чэрвеня — роўна за год да старту II Еўрапейскіх гульняў.**

На дзень пераўвасобіліся ў будаўнікоў першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Максім Рыжанкоў, памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — інспектар па горадзе Мінску Уладзімір Карпяк, старшыня Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Андрэй Шорац, яго намеснікі і кіраўнікі структурных падраздзяленняў гарвыканкама. Як адзначыў **першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Максім РЫЖАНКОЎ**, работа прайшла плённа. Ён падкрэсліў, што праводзіць штогод суботнікі сапраўды правільнае рашэнне. Гэта неабходна для таго, каб у людзей узнікала пачуццё яднання не толькі на глебе асабістых адносін, але і патрыятызму, любові да краіны. Удзел у агульных ініцыятывах дапамагае прыносіць адчувальную карысць грамадству:

— Стадыён — знакавае для краіны і горада месца: тут пройдуць цырымоніі адкрыцця і закрыцця II Еўрагульняў. Да ўводу аб'екта ў строй застаўся невялікі тэрмін, таму трэба дапамагчы будаўнікам па меры магчымасцяў.

Работа па рэканструкцыі стадыёна арганізавана ў тры змены: у залежнасці ад часу сутак тут працуюць да 1,5 тыс. чалавек. У планах на найбліжэйшы час — абсталяванне асноўнага і рэзервовага газонаў. Інфармацыяй аб ходзе будаўнічых работ падзяліўся **старшыня Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Андрэй ШОРАЦ.**

У Мінску колькасць актывістаў, якія ўдзельнічалі ў суботніку, склала больш за 600 тысяч чалавек. У лідарах сталіца і па сабраных сродках — гэта каля двух мільёнаў рублёў. Грошы пойдуць на добраўпарадкаванне значных сацыяльных аб'ектаў, так, частка сумы будзе аддадзена на закупку абсталявання для бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі.

Прадстаўнікі грамадскіх аб'яднанняў, устаноў і прадпрыемстваў працавалі на добраўпарадкаванні як буйных аб'ектаў, так і тэрыторый каля дамоў і офісных будынкаў. Вялікім суботнікам работа па навядзенні парадку ў горадзе не абмяжуецца. 1 красавіка ў сталіцы пачаўся месячнік па ўборцы, добраўпарадкаванні і азеляненні. Падчас яго правядзення асаблівая ўвага будзе ўдзелена дваровым тэрыторыям, рамонту дзіцячых і спартыўных пляцовак, уладкаванню газонаў і кветнікаў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ,**
**Ірына АСТАШКЕВІЧ,**
**Маргарыта УШКЕВІЧ,**
**Нэлі ЗІГУЛЯ,**
**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ,**
**Дар'я КАСКО.**

# ЯКІЯ ЗМЕНЫ НА ДРУГАСНЫМ РЫНКУ ЖЫЛЛЯ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У выніку афармленых за студзень—сакавік здзелак, адна- і двухпакаёвыя кватэры стандартных спажывецкіх якасцяў падаражалі практычна на 200 рублёў за квадратны метр, а трохпакаёвыя на 100 рублёў за «квадрат».

Цэны на гатовыя да пражывання кватэры залежалі, як ад якасці рамонту і пакінутай мэблі/тэхнікі, так і ад узросту дома. Пры гэтым у шэрагу выпадкаў месцазнаходжанне не аказвала істотнага ўплыву. Напрыклад, калі кватэра размяшчалася ў доме ранейшай, чым 2000 года пабудовы і магла пахваліцца свежым рамонтам, то месцазнаходжанне не мела істотнага ўплыву на цану. Большае значэнне мела якасць рамонту. У той жа час цэны на кватэры з ужо не свежым рамонтам значна мацней залежалі ад тэрытарыяльнага размяшчэння.

**Сярэднія цэны здзелак з кватэрамі другаснага рынку на сакавік 2018 года**

| | Стандартных спажывецкіх якасцяў | | Гатовыя да пражывання (з рамонтам і мэбляй) | |
|---|---|---|---|---|
| кватэры | цана м², BYN | кошт кватэры | цана м², BYN | кошт кватэры |
| 1 п. | 2520 | 86 000 | 2880 | 100 000 |
| 2 п. | 2320 | 116 000 | 2620 | 132 000 |
| 3 п. | 2080 | 136 000 | 2500 | 150 000 |

### Адсутнасць таннага

Адна з асаблівасцяў бягучай сітуацыі ў тым, што з рынку фактычна зніклі танныя кватэры. І тое, што цяпер прапануецца танней як за 2 тысячы рублей за квадратны метр, дык гэта жыллё, як правіла, валодае нейкімі істотнымі заганамі — альбо размешчана ў самых аддаленых або праблемных раёнах, альбо запатрабуе проста астранамічных намаганняў для прывядзення яго ў жылы выгляд.

Каля 40 % патэнцыйных пакупнікоў аддаюць перавагу кватэры ў новабудоўлях і дамах, пабудаваных пасля 2010 года. Аднак, істотны рост цэн на сучасныя каркасна-блокавыя дамы прымушае пакупнікоў разглядаць кватэры ў іншых сегментах рынку.

У другой палове мінулага года, разам з ростам цэн, колькасць іншагародніх пакупнікоў стала змяншацца. Але ў бягучым годзе мы зноў бачым іх вяртанне. Ад месяца да месяца іх колькасць нестабільная, але ў сярэднім пакупнікоў з рэгіёнаў каля 14 % ад агульнай колькасці здзелак.

### Сектар па рабоце з іпатэкай

Цяпер другасны рынак жылля па-ранейшаму актыўна падтрымліваецца банкаўскімі крэдытамі. Больш за 30 % кватэр на рынку набываецца з выкарыстаннем крэдытных сродкаў. Як правіла, пакупнік прыцягвае крэдыты для даплаты той сумы, якая адсутнічае пры куплі кватэры большай плошчы або размене. Нягледзячы на тое, што колькасць крэдытных праграм не параўнаецца з колькасцю прапанаваных на продаж кватэр, усё роўна, для шматлікіх пакупнікоў менавіта ўзяцце крэдыту ўяўляе асноўную цяжкасць.

Каб спрасціць для пакупнікоў набыццё кватэры ў крэдыт, найбуйнейшыя агенцтвы сфарміравалі свой уласны сектар па рабоце з іпатэкай і заключылі партнёрскія адносіны з большасцю банкаў. Дзякуючы гэтаму ў кліентаў з'явілася магчымасць выбраць кватэру (як новабудоўлю, так і другаснага рынку) і падаць заяўку на атрыманне крэдыту аднachасова — проста з офіса, што значна спрашчае і паскарае рашэнне жыллёвага пытання.

### Тры магчымыя сцэнарыі

Чаго чакаць у далейшым? Знізіць ўзровень попыту можа толькі рост цэн і, адпаведна, рост крэдытнай нагрузкі. Пры захаванні існуючых на рынку тэндэнцый, рост цэн на рынку магчымы на працягу наступных некалькіх месяцаў. Пры гэтым будзе назапашвацца аб'ём прапановы кватэр, выстаўленых на рынак па завышанай цане.

Варта ўлічваць, што не менш за 70 % здзелак на рынку «ланцуговыя» і яны фактычна грунтуюцца на даплаце, якую ўносіць пакупнік. Рост цэн на кватэры пацягне за сабой павелічэнне аб'ёму даплаты і павелічэнне памеру патрабаванага для куплі крэдыту. Пры адсутнасці росту даходаў насельніцтва, абслугоўванне запазычанасці па крэдытах будзе станавіцца менш даступным, нават пры нізкіх стаўках на крэдыт. У выніку колькасць заключаных здзелак на рынку будзе зніжацца і пацягне за сабой стабілізацыю цэн, а ў далейшым і іх падзенне.

Разгледзім другі сцэнарый. У выпадку, калі стаўкі па крэдытах вырастуць (нават нязначна), а беларускі рубель будзе заставацца стабільным, што тады?

У гэтым выпадку на працягу аднаго—трох месяцаў цэны стабілізуюцца пры адначасовым зніжэнні аб'ёму на рынку здзелак. Фактычна, рост крэдытаў, у паўгадавой перспектыве, пацягне за сабой адкат цэн — у межах 2—5 %.

Па трэцім сцэнарыі істотна растуць стаўкі і замежная валюта. Гэта, мабыць, самы крытычны сцэнарый. Пры значным павелічэнні ставак крэдытавання і росце абменнага курсу USD на працягу некалькіх месяцаў можа адбыцца так званы абвал рынка, калі цэны пойдуць уніз пры мінімальнай колькасці існуючых здзелак.

**Сяргей КУРКАЧ.**

### ❍ Дарэчы

## МЕТР Б'Е РЭКОРДЫ

**Сярэдняя цана прапановы кватэр у Мінску ўзрасла да 1300 долараў за метр упершыню з пачатку 2016 года.**

Як паведамляюць эксперты Realt.by, за апошні тыдзень яна павялічылася яшчэ на два долары. Такая высокая цана жылля ў Мінску апошні раз фіксавалася ў студзені 2016 года. Цяпер цана прапановы аднапакаёвых кватэр роўная 1394 доларам за квадратны метр, двухпакаёвых — 1300 доларам, трохпакаёвай — 1241 долару за «квадрат».

Цэны на нерухомасць растуць з ліпеня 2017 года. Тады быў зафіксаваны дзесяцігадовы мінімум — 1133 долары за метр.

Варта заўважыць, што прыведзеныя лічбы — гэта цэны, якія выстаўляюць прадаўцы. Сярэдняя цана рэальна заключаных здзелак у сакавіку складала 1236 долараў за квадратны метр.

## ■ Надвор'е

# Кароткачасовы дождж, магчымы навальніцы

### Спецыялісты лічаць, што скарбонка ападкаў папоўніцца, але цалкам кампенсаваць красавіцкі дэфіцыт не атрымаецца

**Дажджлівае надвор'е чакаецца ў нас на гэтым тыдні, паведамілі эксперты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Сёння франтальны падзел з суседняй Польшчы прынясе на большую частку тэрыторыі краіны кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах магчымы навальніцы. Вецер заходні ўмераны, пры навальніцах парывісты. Максімальная тэмпература паветра будзе плюс 11—18 градусаў, у паўночна-ўсходніх раёнах — 9—10 цяпла. У сераду на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах магчымы навальніцы. Уначы і раніцай слабы туман. Вецер заходні ўмераны, удзень па Віцебскай вобласці парывісты. Уначы чакаецца ад плюс 4 да плюс 10 градусаў, удзень — 10—17 цяпла, па поўдні месцамі — ад плюс 18 да плюс 22 градусаў.

Будзе дажджліва і ў чацвер, а ў асобных раёнах магчымы навальніцы. Вецер заходні ўмераны, месцамі парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ад 4—6 цяпла па поўначы і да плюс 11—13 градусаў па поўдні краіны. Удзень чакаецца ад плюс 12 да плюс 18 градусаў, па поўдні месцамі паветра прагрэецца да 20 цяпла. У пятніцу ўначы месцамі, а ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах магчымы навальніцы. Вецер заходні ўмераны. Тэмпература паветра ўначы будзе ад 4 да 11 градусаў вышэй за нуль, а ўдзень — 10—17 цяпла. У асобных раёнах краіны, пераважна па паўночнай палове, чакаюцца невялікія дажджы і ў суботу. Уначы і раніцай слабы туман. Вецер заходні ўмераны. Тэмпература ноччу — 1—7 цяпла, удзень будзе ад плюс 12 па паўночным усходзе да плюс 20 градусаў па паўднёвым захадзе краіны.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у нядзелю месцамі па краіне прагназуюцца кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Вецер паўночна-заходні ўмераны. Тэмпература паветра ўначы — 2—8 цяпла, у паўднёва-заходніх раёнах — ад плюс 9 да плюс 11 градусаў. Удзень будзе плюс 15—21 градус, па паўднёвым захадзе — 22—25 цяпла.

Характэрнай асаблівасцю надвор'я ў гэтым месяцы стаў павышаны тэмпературны фон і недабор ападкаў. На большай частцы тэрыторыі краіны іх выпала менш за 50 % месячнай нормы.

**Сяргей КУРКАЧ**

■

СОЮЗ ЕВРАЗИЯ
№ 8 (92) Вторник, 24 апреля 2018 года Для читателей Беларуси, России, Казахстана, Армении, Кыргызстана
Выходит 2 раза в месяц Издается с 26 апреля 2014 года

## Итоги и прогнозы прошедшего молочного форума


Фото БелТА

# ШИРЕ, ВЫШЕ, МОЩНЕЕ!

**На минувшей неделе в Минске состоялся четвертый специализированный экспортный форум «Беларусь молочная», на котором за два дня более 400 участников из 15 стран мира обсудили положение дел в мировой молочной отрасли, отдельно рассмотрев ситуации в Беларуси, России, ЕС и ЕАЭС. Помимо теоретической работы на профильных секциях, бизнесмены, менеджеры и закупщики получили возможность на месте провести переговоры, чтобы впоследствии заключить выгодные контракты на приобретение необходимого оборудования и сырья. По итогам прошедшего форума корреспонденты «СЕ» собрали самое важное, о чем говорили на мероприятии.**

## «Нам, собственно, делить нечего»

**Министр сельского хозяйства и продовольствия Беларуси Леонид ЗАЯЦ** в своем приветственном слове на первой секции форума отметил, что Беларусь в последние годы обеспечивает неплохую динамику развития отрасли молочного скотоводства. «Учитывая, что внутренний молочный рынок нашей страны стабилизировался, мы обеспечили полный достаток на продовольственных полках, то главная задача белорусских предприятий до 2020 года и на дальнейшую перспективу — обеспечение конкурентоспособной молочной продукции по цене и, безусловно, по качеству, чтобы она (продукция. — **Прим. ред.**) была привлекательной и востребованной у покупателя. Вот на это мы должны направить все свои усилия», — подчеркнул Леонид Заяц.

По его словам, нынешние результаты в данной отрасли стали возможны благодаря верной государственной программе, выбранной много лет назад. Благодаря ей удалось не только исправить положение в животноводстве, но и построить новые комплексы, реконструировать и модернизировать тысячи ферм. На основе всего этого удалось обеспечить динамику роста, а также высокое качество молочной продукции. Однако, как справедливо заметил Леонид Заяц, совершенству нет предела.

Он также добавил, что именно на экспортном форуме участники должны дополнять друг друга, используя опыт Беларуси, России и других государств. «Ведь нам, собственно, делить нечего, — подчеркнул министр. — Поэтому мы хотели бы выстроить нормальные экономические отношения (между Беларусью и Россией. — **Прим. ред.**), дополняя друг друга сегментом той продукции, которой не хватает на наших продовольственных полках. Хотелось бы найти понимание со всеми переработчиками и со всеми производителями молока России в том плане, что мы, безусловно, сегодня люди не чужие».

В заключении своего выступления Леонид Заяц выразил уверенность в том, что Беларусь и Россия способны наладить свои взаимоотношения в молочной отрасли.

## К разговору о главном

Центральным приоритетом экспорта белорусской молочной промышленности является диверсификация. **Начальник главного управления внешнеэкономической деятельности Министерства сельского хозяйства и продовольствия Беларуси Алексей БОГДАНОВ** отметил, что в условиях острой конкуренции на внешних рынках продовольствия, в том числе молочном, необходимо учитывать тенденции в нормопроизводстве, реагировать на изменения конъюнктуры для того, чтобы своевременно корректировать производственные и экспортные планы не только с целью укрепления позиций, но и для расширения своего присутствия.

«Мировые производители в текущем году не сбавляют темпы производства, а, наоборот, их увеличивают, — сказал Алексей Богданов. — В планах нашей страны также нарастить объемы».

Беларусь входит в пятерку крупнейших мировых экспортеров основных видов молочной продукции. При этом о стабильной динамике роста на протяжении последней пятилетки говорить не приходится. Январь — февраль текущего года продемонстрировали падение экспорта молочной продукции в стоимостном выражении на 7 %. Ассортимент поставляемых продуктов стабилен, самый емкий из них за прошлый год — это сыр — 32,5 % от общего экспорта «молочки». Второе место — масло, третье — сухое обезжиренное молоко.


Фото Анны ЗАНКОВИЧ.

Молочную продукцию Беларуси в 2017-м поставляли в 46 стран. Конечно же, лидирует Россия. Еще в 2015 году на долю российского рынка приходилось 96,6 % (!) от общего экспорта молочной продукции, но с каждым годом россияне стремятся наращивать производство молока. В связи с известными ограничениями с российской стороны сегодня происходит переориентация товарных потоков, в результате чего в 2017 году доля этого рынка по сравнению с 2016-м сократилась на 6 % и составила 90,2 %. «Это самый низкий показатель за последние пять лет», — подчеркнул эксперт.

В страны СНГ поставки молочной продукции Беларуси выросли практически в три раза. Доля этих стран в 2017-м составила 7,7 %, а это — $165,3 миллиона, зафиксирован рост. Наиболее активная торговля идет с Казахстаном, Кыргызстаном, Азербайджаном и Украиной.

Экспорт в страны дальнего зарубежья в 2017 году за последние пять лет был максимальным — $43 миллиона, в этом году ожидается сохранение растущего тренда. «Это сформировано за счет экспорта сухого молока и масла, то есть тех товаров, по которым произошло падение экспорта в Россию», — сказал Алексей Богданов.

География поставок белорусской продукции широка, для становления системной «далекой» торговли требуется четкая стратегия предприятий, креативный подход к продажам, маркетинговые исследования — такую позицию озвучил спикер.

Что касается Китая, то здесь в 2016—2017 годах на право поставки молочной продукции были аккредитованы 48 заводов, однако реально это делали лишь девять из них. Ассортимент товаров расширился с трех видов до семи. «Китайский рынок — достаточно сложный, у него есть свои требования к упаковке, фасовке, маркировке, логистике, но его емкость велика», — добавил Алексей Богданов.

**Владислав ЛУКАШЕВИЧ.**

### ➢ ЧТО ЖДЕТ МИРОВОЙ РЫНОК «МОЛОЧКИ» В БЛИЖАЙШИЕ ГОДЫ?

Экспертным мнением по этому поводу поделился **исполнительный директор «Союзмолоко» (Россия) Артем БЕЛОВ.** В сельскохозяйственной сфере рынок молочных продуктов считается одним из наиболее развивающихся. «Если мы посмотрим на динамику последних пяти лет, то рынок показывал очень неплохой темп роста, — отметил специалист. — В среднем он составляет порядка 2,3 %, но по ряду категорий был выше. По молоку за пять лет — вверх на пять процентов, по сырам — шесть процентов, по сливочному маслу — более чем на 11 %».

